А музыка вечная

# ШМАТ ЦІКАВЫХ ГАЛАСОЎ

## Паабяцалі гледачам арганізатары XXXII Міжнароднага фестывалю «Студзеньскія музычныя вечары»

**Здавалася б, толькі нядаўна апусцілася заслона вераснёўскага фестывалю «Белая вежа» ў Брэсце, а ўжо «Вечары» на парозе — студзеньскія. І праўда, застаўся нейкі месяц да свята класічнай музыкі, таму арганізатары і склікалі прэс-канферэнцыю. Утваральнікі форуму засталіся ранейшыя, а вось удзельнікі, як нам сказалі, будуць спрэс новыя.**



**Заснавальнік, дырэктар і галоўны рэжысёр фестывалю, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За развіццё міжнародных культурных сувязяў» Лілія БАТЫРАВА** чатыры гады таму адзначыла сваё 80-годдзе, але ўзрост ёй не перашкода. Лілія Рыгораўна вядзе перагаворы з самымі рознымі зоркамі музычнага мастацтва, ездзіць на конкурсы і фестывалі, дзе знаходзіць будучых удзельнікаў зімовага фэсту. Так было і цяпер, калі рыхтаваўся сёлетні фестываль — трыццаць другі па ліку.

Да пачатку брыфінгу заставалася крыху часу, і Лілія Батырава згадзілася адказаць на пытанні карэспандэнта «Звязды».

***— Лілія Рыгораўна, з чаго ўсё пачыналася, як нарадзілася ідэя праводзіць міжнародныя фестывалі класічнай музыкі, і не ў сталіцы, а ў Брэсце? Тым больш што ў канцы 80-х стаў адчувальным дэфіцыт усяго, у тым ліку сродкаў...***

— Ну, не адразу ўзнік фестываль. Колькі сябе памятаю, заўсёды працавала, вучыла дзяцей музыцы ў сваім каледжы. А каб дзеці маглі пачуць ужывую і душой адчуць высокую музыку, па магчымасці запрашала яе майстроў. Так арганізоўваліся канцэрты, завязваліся знаёмствы. З часам усё гэта перарасло ў фестываль. І на нашым фэсце пабывалі ўжо дзясяткі оперных зорак сусветнага маштабу.

***— Адкуль вы чэрпаеце энергію на такую вялікую работу?***

— Вядома, ад гледачоў, аматараў сапраўднай музыкі. Уявіце сабе, іду па плошчы Леніна 6 верасня пасля ўрачыстага адкрыцця святкавання 1000-годдзя Брэста, а да мяне падыходзяць людзі і пытаюць: «Скажыце, а ў студзені фестываль будзе?» Кажу: «Вядома, будзе». Аказваецца, людзі непакоіліся, што ў сувязі з вялікімі святкаваннямі можа не хапіць сродкаў альбо сіл на арганізацыю «Вечароў». Больш за тое скажу: у нас у горадзе ёсць каля дзясятка сем'яў пенсіянераў, якія з кожнай пенсіі адкладваюць пэўную суму грошай, каб наведаць усе канцэрты фестывалю. Ну хіба можна нейкім чынам падмануць іх спадзяванні?!

Ёсць усе падставы чакаць, што і гэтым разам мы адчуем сапраўдную асалоду класічнай музыкі. Афіша фестывалю разнастайная і цікавая. Выступяць удзельнікі з 10 краін: Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі, Польшчы, Грузіі, Літвы, Кітая, ЗША, Нідэрландаў. Магчыма, і з Італіі, пакуль ідуць перагаворы і ўзгадненні.

«Гэтым разам удалося запрасіць многа цікавых галасоў, будзе аж 12 вакалістаў, такога ніколі не было. З іх многія выступяць на фестывалі ўпершыню, — паведаміла арганізатар форуму на прэс-канферэнцыі. — Напрыклад, Тарас Штонда, бас, зорка сусветных оперных тэатраў, саліст Нацыянальнай оперы Украіны. Будзе таксама лаўрэат многіх міжнародных конкурсаў брэстаўчанка Аляксандра Мамінава, сапрана. Хачу прапанаваць ім заспяваць дуэтам, і гэта можа стаць прыемным сюрпрызам фестывалю», — падзялілася даволі смелымі планамі яго дырэктар.

Да яго сюрпрызаў, відаць, можна аднесці і выступленне зусім юных піяністак з Літвы Каі і Клеі Кашубайтэ. Дзяўчынкам 9 і 11 гадоў, але іграюць яны чароўна, паводле слоў Ліліі Батыравай. Яна пачула іх у Вільнюсе, там і запрасіла.

Цікавым абяцае стаць выступленне саліста опернай трупы Паўночнай Амерыкі і Еўропы, саліста Балтыморскага опернага хору барытона са Злучаных Штатаў Амерыкі Альберта Нідэля. Як і трыа кампазітара і лаўрэата міжнародных конкурсаў з Польшчы Канстанціна Віленскага (фартэпіяна), дырэктара Брэсцкага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Р. Шырмы Алега Роўды (ударныя інструменты) і лаўрэата міжнародных конкурсаў Вячаслава Пляско з Брэста (кантрабас). Яны выступяць у суправаджэнні Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава.

Як ужо гаварылася, многія музыканты і выканаўцы прыедуць у Брэст упершыню. У іх ліку саліст Вялікага тэатра Масквы Георгій Чалідзэ (бас), лаўрэат міжнародных конкурсаў выкладчык інстытута імя Гнесіных Кацярына Мачалава (мандаліна, домра), лаўрэат міжнародных конкурсаў Дар'я Іонкіна (фартэпіяна) з Масквы, а таксама салісты Вялікага тэатра Беларусі Станіслаў Трыфанаў (барытон) і Ілья Сільчукоў (барытон). Апошні з названых — лаўрэат трох гранд-прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, уладальнік залатога медаля за перамогу ў намінацыі «Акадэмічныя спевы» II Сусветных Дэльфійскіх гульняў, лаўрэат першых прэмій шэрагу міжнародных конкурсаў.

Прыедзе да нас і Кіеўскі маладзёжны хор «Сафія». Хор з такім трыумфам выступіў летась, што яго з радасцю запрасілі зноў.

Усяго на фестывалі, які пройдзе з 9 да 12 студзеня, выступяць пяць аркестраў, два хоры. Запланаваны калядны баль, які адбудзецца 11 студзеня. Музычныя вечары пройдуць у два аддзяленні, пачатак у 18 гадзін. Акрамя таго, 12-га чысла а 12-й гадзіне адбудзецца канцэрт у музычным каледжы. Туды можна трапіць усяго за 5 рублёў. А ў касцёле ў гэты дзень прагучыць канцэрт арганнай музыкі. У праграме пазначана выступленне народнага артыста Беларусі прафесара Ігара Алоўнікава, а таксама Таісіі Засім (сапрана) і Ніны Залатніцкай (мецца-сапрана). Цана білетаў на асноўныя канцэрты выглядае дэмакратычна, за іх просяць ад 20 да 50 рублёў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «Брестское отделение Бел.ж.д.» Локомотивное депо Брест**

| Наименование и местоположение объекта | Общая площадь, кв. м | Целевое назначение | Сумма арендной платы, БАВ | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** – помещение площадью 24,4 кв. м, расположенное в капитальном строении с инвентарным номером 100/С-26447 (наименование: здание гаража; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта) по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Герцена, 73Б | 24,4 | Хранение машин и механизмов; хранение непродовольственных товаров (кроме взрывоопасных и легковоспламеняющихся); оказание услуг по обслуживанию и ремонту автомобилей | 18,30 | 103,09 | 10,31 |
| **ЛОТ № 2** – помещение площадью 24,3 кв. м со смотровой ямой 5,5 кв. м, расположенное в капитальном строении с инвентарным номером 100/С-26447 (наименование: здание гаража; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта) по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Герцена, 73Б | 24,3 со смотровой ямой 5,5 | | 18,23 1,0 | 125,91 | 12,59 |

| | |
|---|---|
| **Продавец** | Локомотивное депо Брест, Брестская обл., г. Брест, ул. Скрипникова, 135, УНП 200274028, тел. 80162261963 |
| **Организатор аукциона** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |
| **Условия** | 1. Срок аренды – 3 (три) года. 2. С победителем аукционных торгов в течение 10 (десяти) рабочих дней будет заключен договор аренды. 3. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка. 4. Возместить Организатору аукциона расходы по их проведению в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |

**Аукцион состоится 10 декабря 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, и иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81

Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. № 624, от 23.09.2011 г. № 431, от 10.01.2013 г. № 14) – 10 базовых величин

**Последний день приема заявлений – 9 декабря 2019 г. до 17.00**


# Другі раз запар і ўпершыню ў гісторыі:

## Польшча стала пераможцай дзіцячага «Еўрабачання-2019»

**24 лістапада завяршыўся Дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2019», пераможцай якога стала Вікі Габар з Польшчы. Яе кампазіцыя «Супергерой» па выніках галасавання журы і тэлеаўдыторыі атрымала 278 балаў. У тройку найлепшых увайшлі Яржан Максім з Казахстана (атрымаў 227 балаў) і Мелані Гарсія з Іспаніі (212 балаў), прычым гэтая краіна вярнулася на конкурс пасля 13-гадовага перапынку. Беларуска Ліза Міснікава заняла 11-е месца.**




Вікі ГАБАР.

Фінальнае песеннае шоу прайшло ў Глівіца-Арэне (Польшча), якая ўмяшчае звыш 30 тысяч гледачоў. Тэлеаўдыторыя песеннага спаборніцтва традыцыйна была шматмільённая. Па словах арганізатараў, за кампазіцыі юных артыстаў аддалі свае галасы 3,77 мільёна чалавек. Сёлетні конкурс прымаў удзельнікаў з 19 краін свету. На суд журы і міжнароднай глядацкай аўдыторыі свае выступленні прадставілі Аўстралія, Францыя, Расія, Паўночная Македонія, Іспанія, Грузія, Беларусь, Мальта, Уэльс, Казахстан, Польшча, Ірландыя, Украіна, Нідэрланды, Арменія, Партугалія, Італія, Албанія, Сербія.

Польшча ўжо другі год запар атрымала перамогу — раней на дзіцячым конкурсе такога не было. Вікі Габар — 12-гадовая спявачка, якая нарадзілася ў Германіі, пачатковую адукацыю атрымлівала ў Вялікабрытаніі, а цяпер жыве ў Польшчы. Сёлета дзяўчына таксама стала фіналісткай польскага шоу «Голас. Дзеці». На сцэне Дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2019» Вікі выступіла з песняй «Супергерой» (яркім акцэнтам нумара стаў сурдапераклад пасылу кампазіцыі ў выкананні балета).



Ліза МІСНІКАВА.

Калі казаць пра агульную палітру конкурсных кампазіцый, то яна і гэтым разам аказалася разнастайная. Балады і танцавальныя трэкі, розныя па пасыле і з акцэнтамі ў сцэнічным афармленні, дазволілі кожнаму з удзельнікаў прадэманстраваць свае вакальныя і артыстычныя магчымасці, выказаўшыся на важныя і актуальныя тэмы: спявалі пра каханне, экалогію, важнасць не адступаць ад сваёй мары і аб'ядноўвацца дзеля агульнай мэты. Песеннае спаборніцтва прайшло пад слоганам «Share the joy!» («Падзяліся радасцю»), а лагатыпам стаў паветраны змей з агнямі, што, па словах арганізатараў, сімвалізавала свабоду, свет і радасныя імгненні.

Беларусь на Дзіцячым конкурсе песні «Еўрабачанне-2019» сёлета прадстаўляла 14-гадовая мінчанка Ліза Міснікава. Яе кампазіцыя «Попельны» набрала 92 балы і заняла 11 месца. Адразу пасля фіналу наша канкурсантка звярнулася да сваіх падпісчыкаў у «Інстаграме»: «Сябры! Вы ў мяне самыя лепшыя! Мы зрабілі максімум і дастойна прадставілі нашу краіну. Дзякуй за падтрымку! Віншую Вікі з перамогай! Усё было вельмі класна».

**Алена ДРАПКО. Фота БелТА.**


**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ!**

**ОАО «Слуцкий льнозавод» сообщает, что 10 декабря 2019 года в 10.00 состоится внеочередное собрание акционеров.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

– об увеличении уставного фонда Общества на сумму закрытой подписки;
– об утверждении результатов закрытой подписки на акции;
– об утверждении решения о дополнительном выпуске акций;
– о внесении изменений в Устав Общества.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 2 декабря 2019 года.

Время регистрации участников – в день проведения собрания с 9.00 до 9.45 по адресу: ул. Ленина, 300.

Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров – по паспорту и доверенности.

Наблюдательный совет.

УНП 690657228